вытанчаную аповесць-арабеску "Цудоўны сапфір" у духу "Тысяча і адной ночы", прывабленая такім адрозным ад будзённасці светам арабскага Усходу. Даніну арыенталістыцы будуць аддаваць наступныя пакаленні пісьменнікаў-рамантыкаў: А. Міцкевіч у "Крымскіх санетах", Дж. Байран ва "ўсходніх" паэмах, Т. Мур, В. Гюго і іншыя творцы.

**М. М. Воінава-Страха**

## МАДЫФІКАЦЫЯ ЖАНРУ НАВЕЛЫ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРТУРЫ

Навела ў сучаснай беларускай літаратуры з'яўляецца адным з запатрабаваных жанраў. Павышаная цікавасць да гэтага жанру абумоўлена абазначанымі яшчэ некалі В. Бялінскім фактарамі – "агульнай патрэбай" і "пануючым духам часу". Гістарычныя эпохі прыходзяць адна на змену другой, мяняецца вядучая роля духоўна-культурных дамінантаў, эвалюцыянуе і жанравы густ мастакоў слова і чытачоў. Але нязменнымі застаюцца чыннікі прыярытэтнага панавання пэўных жанраў.

Так, сярод асноўных прычын актыўнага звароту да навелы, якую І. Гётэ ахарактарызаваў як "нечуваную падзею", можна вызначыць такія адметныя яе ўласцівасці, як мабільнасць, што найперш праяўляецца ў здольнасці імгненна адгукацца на любыя актуальныя хуткаплынныя працэсы ў прасторы XXI стагоддзя, магчымасць аператыўна і па-майстэрску дакладна занатоўваць нават самыя супярэчлівыя моманты быцця. Акрамя таго, невялікі аб'ём і адметная кампазіцыя навелы, яе вострасюжэтнасць, сканцэнтраванасць на незвычайным выпадку дазваляе задаволіць эстэтычна-інтэлектуальныя запыты сучаснага чытача за адносна кароткі прамежак часу.

На працягу гісторыі свайго развіцця навела актыўна эвалюцыянавала ў цесным ўзаемадзеянні з блізкароднаснымі жанрамі апавядання, анекдота, казкі, абразка, прытчы і інш., набываючы пры гэтым спецыфічныя прыкметы, якія сёння дазваляюць адзначыць яе самабытнасць і арыгінальнасць у кантэксце сучаснай жанравай прасторы. Разглядаемы жанр у беларускай літаратуры сфарміраваўся на аснове класічных навелістычных прынцыпаў пад уздзеяннем нацыянальных фактараў развіцця мастацтва слова, увабраў пры гэтым здабыткі розных мастацка-эстэтычных эпох і стыляў, пачынаючы ад Рэнесансу і да постмадэрнізму.

Даследчык В. Жураўлёў, характарызуючы адметнасці дынамікі мастацтва і шляхі ўзнікнення новых жанравых форм, сярод ключавых момантаў акрэсленых працэсаў вызначыў арыентацыю на здабыткі прагрэсіўнага мінулага і пэўную наватарскую самастойнасць. Адзначанае мае напасрэдныя адносіны да кірункаў развіцця і мадыфікацыі жанру навелы ў айчынным мастацтве слова. Арыентуючыся на ўласна нацыянальныя традыцыі і здабыткі сусветнай мастацкай творчасці, беларуская навела прайшла пэўны шлях, звязаны з эксперыментам на ўзроўні формы і зместу. Знаходзячыся

ў стане пошуку індывідуальна аўтарскага стылю, айчынныя пісьменнікі на свядомым ці падсвядомым узроўні ўсё ж прытрымліваюцца ўсталяваных жанравых канонаў. І гэта цалкам натуральны працэс.

У айчынным мастацтве слова XXI стагоддзя можна вылучыць некалькі кірункаў развіцця навелы, дамінуючымі сярод якіх з'яўляецца, з аднаго боку, зварот да класічных традыцый, а з іншага – "раманізацыя жанру" (І. Шпакоўскі), што праяўляецца ў форме разнастайных мадыфікацый у працэсе цеснага ўзаемадзеяння з элементамі жанру апавядання ў рамках адной тэкставай тканкі.

Майстрам навелы ў класічным яе варыянце з'яўляецца А. Федарэнка. У яго творах "Імгненні жыцця", "Госць", "У Нью-Ёрку пылу не бывае", "Сваяк", "Быль", "Вараняка", "Шчыліна", "Тупік" рэалізаваны такія навелістычныя прынцыпы, як лаканізм, дынамізм, кантраснасць, парадаксальнасць, "пуэнтычнасць" (востры, рэзкі, нечаканы паварот), прасторава-часавая лакалізацыя, сфакусаванасць на адзінай незвычайнай падзеі.

У творах такіх айчынных аўтараў, як У. Сцяпан, Ю. Станкевіч, А. Наварыч, А. Казлоў назіраецца тэндэнцыя да выхаду па-за межы традыцыйна сфарміраваных навелістычных рамак. "Адзінства эфекту ці ўражання" (Э. По) парушаецца з прычыны пашырэння наратыўнай прасторы дзякуючы дэталізацыі, псіхалагізацыі, разгалінаванню сюжэтнай лініі, ускладненню кампазіцыйнай арганізацыі тэксту, што праяўляецца ў яго шматузроўневасці, комплексным спалучэнні розных мастацкіх прыёмаў і сродкаў, шырокай варыятыўнасці спосабаў выражэння навелістычнага зачыну, развіцця дзеяння, кульмінацыі і развязкі, у выніку чаго ўтвараюцца розныя структурныя мадэлі.

Актыўнай тэндэнцыяй у развіцці жанру на сучасным этапе развіцця айчыннага мастацтва слова з'яўляецца змяшчэнне дзеяння са знешняга ва ўнутраны падзейны план. Уласцівая жанру парадаксальнасць усё часцей праяўляецца на ўзроўні адлюстравання маральна-этычнай, духоўнай супярэчнасці героя. У цэнтры ўвагі аўтараў, здавалася б, няўлоўная, але такая магутная па сіле ўздзеянння на псіхаэмацыянальны стан асобы праца падсвядомага, экзістэнцыя ва ўсёй складанасці і шматстайнасці праяўлення, існаванне душы на перакрыжаванні свету рэальнага і таго, што знаходзіцца па-за межамі быцця зямнога, аналіз сэнсу чалавечага жыцця праз прызму захавання ці, наадварот, адмаўлення ад рэалізацыі законаў універсальнай аксіялагічнай сістэмы. Пытанні сутнаснай напоўненасці ці абсурднасці асобаснай жыццядзейнасці, максімальнай мяжы трываласці і ступені ўстойлівасці духоўнага стрыжня вырашаюцца праз зварот да філасофіі экзістэнцыялізму і сюррэалізму (А. Палачанскі).

Вышэйакрэсленыя тэндэнцыі арганізацыі тэксту прыводзяць да парушэння сфармуляванай тэарэтыкам жанру М. Пятроўскім дысцыпліны сюжэтаскладання: структурныя кампаненты могуць размяшчацца ў адвольнай паслядоўнасці, што ўжо не дазваляе кваліфікаваць сучасную навелу як кароткі аповед, разлічаны на адзінства і непарыўнасць успрымання. Але ж

якога б узроўню эксперыментавання ні дасягалі пісьменнікі, у непарушным стане захоўваецца навелістычная дамінанта, якая складаецца з выразнай супярэчнасці, несупадзення, памылкі, кантрасту (Б. Эйхенбаўм). Змяненням падвяргаецца план яе рэалізацыі, а характар застаецца непахісным, што і забяспечвае стабільную аснову функцыянавання жанру навелы ў сучаснай беларускай літаратуры.

**Т. Г. Казакевіч**

## МІНІМАЛІЗАЦЫЯ ЯК МОЎНЫ ПРАЦЭС

Развіццё і функцыянаванне мовы абумоўлена тымі працэсамі, якія ў ёй адбываюцца. З аднаго боку, у мове дзейнічае механізм дэталізацыі, канкрэтызацыі паняцця, думкі, з другога – чалавек імкнецца выкарыстоўваць мову эфектыўна, змяншаючы свае фізіялагічныя і інтэлектуальныя выдаткі ў працэсе зносін. Імкненне да эканоміі моўных намаганняў, сродкаў сёння з'яўляецца адной з найбольш заўважных унутраных асаблівасцей любой мовы і выклікана жаданнем чалавека дасягнуць у сваёй дзейнасці найлепшага выніку з мінімальнымі выдаткамі і эканоміяй часу, што абумоўлівае працэс *мінімалізацыі* маўлення, які праяўляецца на ўсіх моўных узроўнях: *фанетычным*, *марфалагічным*, *сінтаксічным*, *лексічным* – праз скарачэнне, рэдукцыю, кампрэсію моўных адзінак.

Мінімалізацыя на ф а н е т ы ч н ы м узроўні праяўляецца ў выпадзенні фанем, складоў, частак слова, сцяжэнні гукаў у гукавой плыні. Адбываецца рэдукцыя ў гутарковым маўленні ў фіналі *-сць* у назоўніках жаночага роду, у дзеяслове *ёсць*, лічэбніку *шэсць* пры хуткім і сярэднім тэмпе маўлення: *у яго ёсць [јос'] надзея, шэсць [шэс'] паверхаў, радасць [радас'] сустрэчы* і інш. Назіраем рэдукцыю на стыку марфем у лічэбніках 50, 60, 70, 80 у дыялектным і гутарковым маўленні з выпадзеннем фіналі *-ць* у першай частцы лічэбніка і першага склада *дзе-* ў другой частцы: *пяцьдзясят [п'аz'ас'ат] і [п'ійс'ат], шэсцьдзясят [шэјс'ат] і [шэјz'іс'ат], семдзесят [с'эмс'ат], восемдзесят [вос'імс'ат]*. Паслядоўна выпадаюць выбухныя зычныя [т] і [д] са спалучэнняў *стн, стл, рдц, рдн* і пад., што змяншае кансанантную насычанасць маўлення: *сардэчны – сэрца, кантраст – кантрасны, кантэкст – кантэксны*. Да спрашчэння можна таксама аднесці і вымаўленне/напісанне аднаго зычнага на месцы падаўжэння ў іншамоўных словах: *калона, група, граматыка, калектыў*. Спалучэнне *дт* у іншамоўных словах таксама спрашчаецца і перадаецца праз *т*: *Кранштат, Шміт*. Адзначаецца сцяжэнне галосных і зычных гукаў, дзе часта папярэднічае асіміляцыя: *Аўрам (з Авраам), дзікабраз (з дзікаабраз), каўка[с]кі (каўказскі), шве[ц]кі (шведскі), узбе[ц]кі (узбекскі), птаства* (*птах* + *ств*).

Мінімалізацыя на м а р ф а л а г і ч н ы м узроўні таксама выразна заўважна ў беларускай мове і на гэтым узроўні мовы выяўляецца ў апушчэнні або скарачэнні частак слова як пры словаўтварэнні, так і пры формаўтва-